УДК 28:94(476)

# СТАНОВІШЧА МУСУЛЬМАНСКІХ АБШЧЫН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIV–XXI стст.

**Мікалаева Людміла Віктараўна**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі
(г. Мінск, Беларусь)

*У тэксце дадзена характарыстыка працэсу з'яўлення мусульман, арганізацыі культу, а таксама эвалюцыі стаўлення дзяржавы да ісламу і яго вернікаў на беларускіх землях у XIV−XXI стст.*

У XIV–XV стст. у выніку ўнутранай барацьбы ў Залатой Ардзе і палітыкі вярхоўнай улады Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), зацікаўленай у прыцягненні татараў, вядомых сваім вайсковым майстэрствам, на землях дзяржавы асела нямала перасяленцаў, што спавядалі іслам суніцкага толку. Значныя абшчыны татараў з мячэцямі ў XV–XVII стст. існавалі ў заходніх і цэнтральных паветах Беларусі – Навагародку, Слоніме, Мінску і іншых гарадах і мястэчках. Мячэці былі асноўнымі культавымі цэнтрамі мусульманскіх прыходаў (джаміятаў) і абслугоўваліся муламі (імамамі). Акрамя правядзення службаў у мячэцях і малітоўных дамах, апошнія выконвалі розныя духоўныя і судовыя фукнцыі, вялі метрыкі. Памочнікамі мулаў былі муэдзіны, якія склікалі вернікаў у мячэць, гучна чыталі малітвы і г.д., а таксама годжы, што вучылі дзяцей чытаць арабскія тэксты і Каран. Набажэнства вялося на арабскай, пазней на татарскай мовах. Аднак на мяжы XVI–XVII стст. татары ў асноўнай масе ў якасці мовы зносін выкарыстоўвалі мову мясцовага насельніцтва. У выніку свяшчэнныя кнігі татараў-мусульман перапісваліся арабскім алфавітам на старабеларускай ці польскай мовах.

Люблінскі сейм 1569 г. пацвердзіў права татарскіх абшчын на будаўніцтва мячэцяў і падрыхтоўку мусульманскага духавенства за мяжой [1, с. 122]. Мусульманскія абшчыны Рэчы Паспалітай XVII–XVIII стст. былі самастойнымі, а пры вырашэнні спрэчных пытанняў у рэлігійных справах звярталіся да муфтыяў Асманскай імперыі або Крыма [10, с. 67]. У другой палове XVIII ст. колькасць татараў у ВКЛ, паводле розных крыніц, складала ад 30 да 60 тыс. чалавек [8, с. 145].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай мусульманскае насельніцтва беларускіх зямель пераважна папоўніла шэрагі адзінаверцаў у Расійскай імперыі, дзе ўрад не чыніў для іх абмежаванняў [1, с. 180; 10, с. 68].

У другой палове XIX ст. у Беларусі было больш за 20 мячэцяў. Яны падзяляліся на саборныя і т. зв. пяціразовыя (у іх збіраліся на малітву штодня



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пяць разоў). У гэты перыяд усе справы, звязаныя з будаўніцтвам і рамонтам мячэцяў, прызначэннем мулаў у беларускіх губернях, вырашаліся і зацвярджаліся ў Таўрычаскім магаметанскім духоўным праўленні ці ў Дэпартаменце духоўных спраў замежных веравызнанняў у Санкт-Пецярбургу. Царскія ўлады пачалі актыўна кантраляваць дзейнасць мусульманскага духавенства.

Перапіс 1897 г. зафіксаваў на беларускіх землях 9,6 тыс. (0,1 %) мусульман [1, с. 180], на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю – 13877 татараў-мусульман [6, с. 35]. Скарачэнне колькасці мусульман было звязана з асіміляцыйнымі працэсамі, міграцыяй іх у Крым, Асманскую імперыю і Польшчу.

У пачатку ХХ ст. у асяроддзі мясцовых татараў пачалі ўзнікаць асветніцкія суполкі, побыт стаў набываць больш свецкі характар, шмат моладзі вучылася ў свецкіх навучальных установах, у т. л. ваенных [10, с. 68].

Пасля Першай сусветнай і польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. у БССР засталося толькі 3,7 тыс. татараў. У БССР разбураліся храмы, у т. л. і мячэці, закрываліся мусульманскія школы, арыштоўвалася духавенства, прадстаўнікі татарскай інтэлігенцыі [6, с. 36].

У Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў 1921–1939 гг. у складзе Польшчы, у 1925 г. было створана Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне. Выдаваліся мусульманскія календары, падручнікі для татарскіх дзяцей, асобныя суры (раздзелы) з Карана на арабскай і польскай мовах. У месцах кампактнага пражывання татараў-мусульман дзеці вывучалі іслам у школах, для чаго ў раскладзе агульнаадукацыйных школ былі прадугледжаны спецыяльныя ўрокі. У 1939 г. тут дзейнічалі 17 мячэцяў і два малітоўныя дамы.

Шмат беларуска-літоўскіх татараў загінула падчас Вялікай Айчыннай вайны, былі дэпартаваны ці эмігравалі ў пасляваенны перыяд за мяжу [7, с. 511].

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ўлады БССР намагаліся ліквідаваць мусульманскія абшчыны. У першыя пасляваенныя гады ў населеных пунктах, дзе жылі беларускія татары, налічвалася 13 мусульманскіх абшчын. У 1955 г. функцыянавала дзве абшчыны ў вёсках Мураўшчызна Іўеўскага і Асмыслова Нясвіжскага раёнаў. Таксама ніколі не зачынялася мячэць у г. п. Іўе Гродзенскай вобласці [1, с. 290].

У 1960–1980-х гг. у Беларусі дзейнічала толькі адна мусульманская абшчына ў Іўі, якая мела невысокую рэлігійную актыўнасць. Другая была зарэгістравана ў Мінску толькі ў 1990 г. [2, с. 221, 223, 224; 4, с. 4].

Апошнія гады характарызуюцца павышанай увагай грамадскасці да ісламу. Яго этнічную аснову ў Беларусі складаюць татары. Таксама да гэтай рэлігіі адносяць сябе жывучыя ў Беларусі азербайджанцы, узбекі, казахі, башкіры, туркмены, таджыкі, афганцы, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. На 1 студзеня 2024 г. у краіне налічвалася 24 ісламскія абшчыны [9].

Да 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічала адна мячэць – у Іўі. Росту мусульманскіх абшчын садзейнічаў Усебеларускі з'езд мусульман у 1994 г. у Мінску, які абвясціў стварэнне Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь, кіруючым органам якога з'яўляецца муфціят на чале з муфціем [1, с. 402]. За апошнія гады ўзведзены мячэці ў Слоніме (1994 г.), Смілавічах (1996 г.), Маладзечне (2002 г.), абноўлены ў Навагрудку (1997 г.), Відзах (1999 г.), Клецку (2000 г.), створаны мусульманскі цэнтр ў Іўі (1998 г.)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[1, с. 402–403; 3, с. 408–409]. У 2002 г. адчынена рэканструяваная Лоўчыцкая мячэць – адна з найбольш старажытных ва Усходняй Еўропе. На 1 студзеня 2024 г. дзейнічалі шэсць мячэцяў і два малітоўныя дамы, у т. л. Саборная мячэць у г. Мінску (з 2016 г.) [5].

Спецыяльных навучальных устаноў для вывучэння ісламу, традыцый і культуры мусульман у Беларусі няма. Падрыхтоўка рэлігійных кадраў мусульман ажыццяўляецца за мяжой [1, с. 403].

Такім чынам, на працягу XIV−XXI стст. становішча мусульман і іх духавенства на беларускіх землях залежала ад спецыфікі канфесійнай палітыкі ўлад тых дзяржаўных утварэнняў, у склад якіх уваходзіла тэрыторыя Беларусі.

## Літаратура

1. Беларусь : страницы истории / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редсовет А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 408 с.

2. Верашчагіна, А. У. Гісторыя канфесій на Беларусі ў 20 стагоддзі / А. У. Верашчагіна // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Навуковае выданне. – Мінск : БелЭн, 2000. – 432 с. : іл. – С. 214−225.

3. Верашчагіна, А. У. Канфесіі, характар іх дзейнасці, адносіны, месца і роля ў сучасным беларускім грамадстве / А. У. Верашчагіна // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Навуковае выданне. – Мінск : БелЭн, 2000. – 432 с. : іл. – С. 404−412.

4. Землякоў, Л. Рэлігійны фактар нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь / Л. Землякоў, М. Шчокін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 1. – С. 3−8.

5. Информация о конфессиональной ситуации в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://belarus21.by/Articles/1439296790. – Дата доступа : 29.03.2025.

6. Канапацкая, З. Нас аб'яднала адзін лёс і адна доля / З. Канапацкая // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 2. – С. 29−39.

7. Канапацкі, І. Татары / І. Канапацкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т.– Мінск: БелЭн, 1993−2003. – Т. 6. Кн. 1: Пузыны – Усая / Беларус. Энцыкл. ; Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. ; Маст. Э. Э. Жакевіч. – 2001. – 591 с.: іл. – С. 508−511.

8. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). – Минск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

9. Религиозные общины в Республике Беларусь (на 1 января 2024 г.) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://belarus21.by/Articles/kolichestvo-religioznyh-obshhin-v-respublike-belarus-na-1-yanvarya-2019-g. – Дата доступа : 29.03.2025.

10. Чаквін, І. У. Фарміраванне канфесій і іх эвалюцыя / І. У. Чаквін // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Навуковае выданне. – Мінск : БелЭн, 2000. – 432 с. : іл. – С. 59−68.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова